колонны и росписи на стенах и потолках комнат. Дворец оформлен множеством коллекций, картин известных мастеров, зеркал и роскошной мебели.

Отмечалось также, что многие залы и салоны во дворце имели разную высоту потолка в зависимости от их величины, в результате чего архитектура интерьера представляется достаточно сложной. Кроме того, паркет в каждой комнате отличался своим уникальным рисунком. Поэтому крайне важную роль в реставрации дворца сыграли фотографии Яна Булгака, дальнего родственника, гостившего во дворце в 1914 году.

Дворец двухэтажный, однако существует «третий этаж», он служил для незаметного перемещения оркестра по зданию. Так оркестр встречал гостей еще у парадной лестницы, сопровождал на протяжении вечера и при этом оставался незамеченным. Слуги также перемещались по тайным ходам, дабы не привлекать лишнего внимания.

Данное исследование помогло расширить и систематизировать знания касаемо культурно-исторического наследия Беларуси на примере дворца Булгаков. Освещение данной темы может способствовать привлечению внимания к истории уникального архитектурного памятника XIX в., Дворцового комплекса в Жиличах, а также других дворцов Беларуси.

## ГІСТОРЫКА-ПАТРЫЯТЫЧНЫ ТУРЫЗМ БЕЛАРУСІ ЯК КРОПКА ПАВЫШЭННЯ ПАЗНАВАЛЬНАСЦІ РЭГІЁНУ ( НА ПРЫКЛАДЗЕ ВАСІЛЯ ЦЯПІНСКАГА З МЯСТЭЧКА ЦЯПІНА )

Гардзіёнак Л.А., Казунка Г.В.
Навуковы кіраўнік: ст. выкладчык Дайняк А.М.
Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт

Не месца ўпрыгожвае чалавека, а чалавек – месца. Для нас такім чалавекам быў і ёсць Васіль Цяпінскі, наш зямляк, а таксама знакаміты гуманіст і асветнік, кнігавыдавец і перакладчык. У глухой вёсцы Цяпіна, якая размешчана ў Віцебскай вобласці ў ста кіламетрах ад Віцебску і за дзвесце кіламетраў ад Мінску, з насельніцтвам каля двухсот чалавек, ён на ўласныя сродкі абсталяваў друкарню і выдаў «Евангелле» на беларускай мове, напісаў да яго «Прадмову», у якой заклікаў адкрываць нацыянальныя школы, развіваць асвету і кнігадрукаванне на роднай мове і не цурацца традыцый, закладзеных продкамі.

Каб захаваць памяць аб славутым земляку вяскоўцы стварылі школьны гісторыка-краязнаўчы музей імя Васіля Цяпінскага, які прыняў сваіх першых наведвальнікаў у 1990 годзе. Плошча музейнай экспазіцыі складае 43,5 м$^2$. У музеі налічваецца 215 экспанатаў асноўнага і дапаможнага фонду.

За час існавання ён стаў цэнтрам гісторыка-краязнаўчай і вучэбна-выхаваўчай працы.

Экскурсаводы музея, настаўнікі, кіраўнікі гурткоў праводзяць тут розныя мерапрыемствы, якія садзейнічаюць выхаванню ў школьнікаў рыс сапраўднага грамадзяніна, патрыёта сваёй Радзімы.

Адзін з разделаў музея прысвечаны жыццю і творчасці гуманіста і кнігавыдаўца В. Цяпінскага. На стэндах прадстаўлены партрэты асветніка. Экспанаты адлюстроўваюць розныя бакі жыцця і творчасці нашага знакамітага земляка, гэта: дакументы, архіўныя матэрыялы, вытрымкі з газет і часопісаў пра дзейнасць Васіля Цяпінскага. Стваральнікі музея імкнуліся зрабіць такую экспазіцыю, каб наведвальнікі маглі адчуць і той час, і тыя ўмовы, у якіх жыў і тварыў Васіль Цяпінскі, а галоўнае – зразумець вытокі яго творчасці, да канца аддадзенай беларускаму народу.

Такім чынам, стварэнне музея ў гонар Васіля Цяпінскага стала эфектыўным спосабам павышэння ўзнаваемасці рэгіёна і ўзбагачэння культурнага ландшафту Беларусі.

Ідэя ўвекавечання памяці вядомага асветніка, гуманіста і кнігадрукара Васіля Цяпінскага належыць невялікай групе энтузіястаў з Цяпіна. Яны захацелі зрабіць нешта маштабнае, але ацэньваючы магчымасці, вяскоўцы вырашылі для пачатку акультурыць крыніцу на ўскраіне вёскі, дзе меркавана знаходзіліся некаторыя будынкі сялібы знакамітага земляка. Арганізацыя работ па аднаўленні і акультурванні крыніцы уключыла ў сябе ачыстку тэрыторыі, стварэнне новых архітэктурных элементаў, установку інфарматыўных таблічак і помнікаў, азеляненне і добраўпарадкаванне навакольнай мясцовасці.

Дзякуючы ўкладу кожнага, агульным намаганням, зараз крыніца акультурана: устаноўлена альтанка, масток і калодзеж з жураўлём. Гэтыя збудаванні прыцягваюць увагу ўсіх, хто праязджае па трасе Орша-Лепель. Ахвотныя спыняюцца, каб пабываць на святым месцы, пачаставацца сцюдзёнай вадой, а то і проста палюбавацца на крыніцу. Няйначай ў вёсцы існуе легенда, што Васіль Цяпінскі часта ездзіў сюды па крышталёва чыстую ваду.

У выніку аднаўлення крыніцы на ўскраіне вёскі было створана ўнікальнае месца адпачынку і пазнання гісторыі для наведвальнікаў, а таксама захаванне і перадача будучым пакаленням каштоўнага, культурнага і гістарычнага значэння рэгіёна. Гэта ўсё спрыяе развіццю турызму ў рэгіёне і прыцягненню новых магчымасцей для развіцця мясцовай супольнасці.

Новай традыцыяй стала правядзенне фестываля ў гонар асветніка. Ужо ў 2021 годзе ў вёсцы Цяпіна арганізавалі народныя гулянні: на мерапрыемстве прайшло касцюміраванае шэсце па вуліцах райцэнтра, конкурсы галаўных убораў "Уся справа ў капелюшы", самадзейных

чытальнікаў і паэтаў "100 радкоў любові да малой радзімы". Таксама, жадаючыя змаглі паспаборнічаць у стварэнні лепшага герба роду Цяпінскіх. Паралельна працавалі тэматычныя пляцоўкі, гандлёвыя рады, выстава-продаж клуба аматараў народнай кухні «Смак», дзе госці змаглі пакаштаваць спрадвечныя стравы чашніцкага краю.

Фестывалі, падобныя гэтаму, таксама праходзілі ў 2022, 2023 годзе і будуць працягвацца далей. Ужо ў 2024 годзе будзе новы фестываль з асаблівай праграмай, з новымі цікавымі пляцоўкамі.

Працяг фестываляў з году ў год адыгрывае важную ролю ва ўмацаванні культурнай і сацыяльнай сувязі ў грамадстве. Гэта дазваляе захоўваць традыцыі і звычаі, перадаваць веды і навыкі ад пакалення да пакалення. Акрамя таго, сталасць фестываляў садзейнічае развіццю інфраструктуры і турыстычнага патэнцыялу рэгіёну, прыцягваючы новых удзельнікаў і гледачоў. Таксама яны спрыяюць фармаванню супольнасці аднадумцаў, якія падзяляюць агульныя інтарэсы і каштоўнасці. Гэта стварае спрыяльную атмасферу для абмену ідэямі, творчасці і супрацы паміж удзельнікамі і гледачамі фестывалю. Правядзенне цікавых і якасных фестываляў дапамагае прыцягнуць увагу шырокай аўдыторыі, а таксама пазітыўна паўплываць на рэпутацыю рэгіёна.

У канчатковым выніку, хацелася дадаць, што гісторыка-патрыятычны турызм сёння – гэта не толькі сродак актыўнага адпачынку, але і крыніца, якая дазваляе развіваць інтэлектуальныя і маральна-валявыя якасці асобы, фарміраваць культуру, высокія грамадзянскія пачуцці – любоў да Айчыны, гонар за дасягненні папярэдніх пакаленняў і сучаснікаў. Падобныя мерапрыемствы накіраваны на папулярызацыю гістарычнай і культурнай спадчыны Беларусі, фарміраванні этыкі адказных адносін да гісторыі нашых народаў як прадмета нацыянальнага гонару, які стане пунктам для павышэння пазнавальнасці рэгіёнаў Беларусі.

**Літаратура**

1. Памяць: Гіст.-дакум. хроніка Чашніцкага раена/ Мінск: Белару. навука, 1997.542 с.

2. Wikipedia. Org [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://ru.wikipedia.org/wiki/Тяпинский,_Василий_Николаевич

3. history-belarus.com [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://history-belarus.com/pages/figures/tiapinsky.php

4. Sb. By [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://www.sb.by/articles/festival-merch-i-pechatnyy-stanok-kak-na-rodine-vasilya-tyapinskogo-vozrozhdayut-pamyat-o-pisatele.html